# СУПРАЦОЎНІЦТВА КАРЭСПАНДЭНТАЎ З ВІЛЕЙСКАГА ПАВЕТА З ГАЗЕТАЙ “НАША НІВА” Ў 1912 ГОДЗЕ

*У. Д. Хмарэнка*
*ДУА “Вілейская гімназія № 2”*
*Навук. кір. – В. В. Кажура, настаўнік-метадыст, магістр пед. навук*

**Анатацыя.** У дадзенай рабоце аналізуецца карэспандэнцыя жыхароў Вілейскага павета ў газету "Наша ніва" і перапіска рэдакцыі з аўтарамі асобных допісаў з Вілейскага павета толькі за 1912 год. Акцэнтуецца ўвага на тым, што ў 34 нумарах з 52 былі змешчаны допісы з Вілейскага павета, а карэспандэнцыя дасылалася з 31 населенага пункта, якія прадстаўлялі амаль усе воласці Вілейскага павета. Свае матэрыялы дасылалі 28 карэспандэнтаў. Аўтар канстатуе, што людзей найбольш хвалявалі сацыяльна-эканамічныя і культурна-асветніцкія пытанні.

**Ключавыя словы**: Наша Ніва; Вілейскі павет; карэспандэнты.

Тэма дадзенай работы была прапанавана кіраўніцтвам Вілейскага краязнаўчага музея для паглыблення і пашырэння інфармацыі пра гісторыю Вілейшчыны.

Даследаванне носіць лакальны характар і аналізуе карэспандэнцыю жыхароў тагачаснага Вілейскага павета ў газету і перапіску рэдакцыі з аўтарамі асобных допісаў з Вілейскага павета толькі за 1912 год. Супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Вілейскага павета з газетай “Наша Ніва” за 1906–1911 гады было прааналізавана ў работах выпускніц Вілейскай гімназіі № 2 Бажэны Мацюк і Яўгеніі Бурак.

Мэта даследавання – вызначыць ступень карэспандэнцкай актыўнасці жыхароў Вілейскага павета, іх выбарачнасць у адлюстраванні падзей грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага руху на Вілейшчыне на пачатку XX ст. (1912 год), градус актыўнасці і якаснага напаўнення перапіскі рэдакцыі газеты з асобнымі аўтарамі.

Для раскрыцця тэмы неабходна было вырашыць наступныя задачы:

1) даць характарыстыку грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага руху на Вілейшчыне ў пачатку XX ст.;

2) вызначыць ролю "Нашай Нівы" ў жыцці Вілейскага павета ў пачатку XX ст.;

3) прааналізаваць тэматыку, аўтарства і актыўнасць карэспандэнтаў з Вілейскага павета ў супрацоўніцтве з "Нашай Нівай", перапіску рэдакцыі з аўтарамі асобных допісаў з Вілейскага павета за 1912 год.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца газета "Наша Ніва" за 1912 год, прадметам – допісы карэспандэнтаў з Вілейскага павета ў газету “Наша Ніва” і перапіска рэдакцыі з аўтарамі асобных допісаў з Вілейскага павета за 1912 год.

Разам з гэтым правяралася гіпотэза: калі "Наша Ніва" – “газета не рэдакцыі, але ўсіх беларусаў і ўсіх тых, хто ім спагадае” [3, с. 1], то на яе старонках павінна было адлюстроўвацца жыццё Вілейскага павета ў пачатку XX ст.

У пачатку XX ст. Вілейшчына нічым асаблівым не вылучалася з агульнай карціны сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця ўсёй тагачаснай Беларусі. Па-ранейшаму ўсюды сустракаліся гандляры, крамы, манапалькі, корчмы. Час ад часу ўспыхвалі пажары. Асабліва моцны ўзнік у ліпені 1910 года. Пылала Вялікая (цяпер Савецкая) вуліца і з ёю суседнія. Згарэла кнігарня Шарлота, крамны рад, рэстаран, шмат пабудоў гараджан.

Прамысловасці ў самім павятовым цэнтры было мала, і яна была прадстаўлена толькі бровარам, лесапільняй і млыном.

Усяго на пачатку XX ст. у Вілейскі павеце было 345 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працавала 639 рабочых [4, с. 141].

Нягледзячы на тое, што па стану на 1 студзеня 1905 года Вілейка лічылася адным з самых малых горадоў як губерні, так і ўсяго Паўночна-Заходняга краю (у горадзе пражывала 2025 мужчын і 1928 жанчын – усяго 3953 чалавекі), на Вілейшчыне ў пачатку XX стагоддзя была нядрэнна адладжана сістэма адукацыі.

У гэты час на тэрыторыі Вілейкі і Вілейскага павета працавалі 11 народных, 4 сельскія аднакласныя, 1 яўрэйскае і 1 трохкласнае гарадское вучылішчы. Асаблівасць гэтых навучальных устаноў заключалася ў тым, што яны былі даступныя ўсім слаям насельніцтва і з’яўляліся першай прыступкай у навучанні.

У павеце дзейнічаліі царкоўна-прыходскія школы і хатнія школы граматы (205 школ). Была адчынена прыватная жаночая прагімназія (1907 г.). У 1901 г. адкрылася школа па навучанню грамаце непісьменнага дарослага насельніцтва Вілейкі. У мястэчку Ільня праводзіліся педагагічныя курсы [4, с. 143].

“Паводле падлікаў супрацоўніка рэдакцыі пісьменніка Ядвігіна Ш., за першыя тры гады “Наша Ніва” надрукавала 906 уласных карэспандэнцый з 499 вёсак, мястэчак і гарадоў, 246 вершаў 61 паэта і 91 апавяданне 36 празаікаў. А ўжо ў 1910 г. у газеце з’явілася 666 карэспандэнцый з 122 населеных пунктаў Віленскай, з 81 – Мінскай, з 49 – Гродзенскай, з 27 – Магілёўскай, з 9 – Віцебскай, з 9 – Ковенскай, 2 – са Смаленскай губерняў і з 14 іншых месцаў (“чужых старон”), а ўсяго разам – з 313 пунктаў. Сярод паветаў найбольшая колькасць карэспандэнцкіх пунктаў была ў Віленскім (48), Слуцкім (39), *Вілейскім (30)*, Гродзенскім (27), Ашмянскім (20), Мінскім (18), Дзісненскім і Барысаўскім (да 9), Лідскім, Сакольскім (па 8), Свянцянскім (7), Аршанскім, Горацкім і Клімавіцкім паветах (па 6)” [1, с. 405].

Як бачым, допісы карэспандэнтаў з Вілейскага павета па колькасці знаходзіліся на адным з першых месцаў сярод усёй карэспандэнцыі ў “Нашу Ніву”.

У 1912 г. выйшлі 52 нумары газеты [3]. У 34 (а гэта 65,4 % ад усіх нумароў за 1912 год) было змешчаны 67 допісаў з Вілейскага павета.

Дадзены факт сведчыць, што "Наша Ніва" не толькі мела пашырэнне ў Вілейскім павеце, але і абуджала актыўнасць мясцовага насельніцтва да супрацоўніцтва.

Калі ўсе допісы з Вілейскага павета ў "Нашу Ніву" згрупаваць паводле тэрытарыяльнага прынцыпу, то можна заўважыць, што карэспандэнцыя дасылалася з 31 населенага пункта.

Найбольшая колькасць допісаў паступала з мястэчка Крайск – 8, з горада Радашковічы і вёскі Вязынь – па 5, з Новай Гуты – 3, са Стаек – 2. З астатніх 26 населеных пунктаў было даслана па адным допісе.

Актывізавалася карэспандэнцкая дзейнасць і ў самім павятовым цэнтры, г. Вілейцы. Калі раней дасылалася па адной карэспандэнцыі за год, то цяпер было прадстаўлена 8 артыкулаў з 67, або амаль 12 % ад усёй карэспандэнцыі.

Калі параўнаць межы пашырэння карэспандэнцыі з Вілейскага павета ў 1912 годзе з граніцамі сённяшняга Вілейскага раёна, то акажацца, што непасрэдна сённяшняя Вілейка і Вілейскі раён былі прадстаўлены 27 допісамі (з 67): з Вілейкі – 8, з Вілейскага раёна – 19.

За 1912 год у “Нашу ніву” даслалі свае матэрыялы 28 карэспандэнтаў. Паводле аўтарства ўсе допісы з Вілейкі і Вілейскага павета можна падзяліць на чатыры групы: допісы пад псеўданімамі (29, або 43 %); допісы пад крыптанімамі (16, або 22 %); ананімныя допісы (2, або 3 %); допісы, падпісаныя сапраўднымі прозвішчамі (20, або 32 %).

У 1912 годзе найбольшай актыўнасцю вызначаліся А. Петрашкевіч (8) і Ф. Красоўскі (3) з Крайска; Мікалай Мокры з вёскі Вязынь (4); Змітрок Бядуля з Пасадца (15: 4 інфармацыйныя допісы, 10 мастацкіх твораў і 1 публіцыстычны артыкул); В. Явар з Гуты Залессе (4); Ядвігін Ш. з Карпілаўкі (4); М. Галка з павятовага горада Вілейкі (4), Мікалай Мар’ін (Мікалай Марвін) з в. Шчукі (2).

Ад іншых карэспандэнтаў было даслана па адным артыкуле.

Нязначная частка лістоў дасылалася ананімна (2 паведамленні). Аднак была вялікая колькасць аўтараў, якія падпісваліся сапраўднымі прозвішчамі: Красоўскі, А. Петрашкевіч, Чэховіч і іншыя.

Шмат допісаў выкарыстоўвалася ў газеце “Наша Ніва” пад псеўданімамі.

Нам удалося адшукаць сапраўдныя прозвішчы васьмі карэспандэнтаў, якія падпісваліся псеўданімамі і крыптанімамі: *Ванда Л.* – Ванда Лявіцкая, *В. Сосен-кі (Сос-скі, В. Со-скі, В. Сос-кі, В. С-кі, В. Сос-нкі)* – Вульф Сосенскі, *Змітрок Бядуля* – Самуіл Плаўнік, *М.* – Юльян Манцэвіч, *Мікола Мокры* – Андрэй Сухі, *Тутэйшы* – Самуіл Плаўнік, *Юзя Шчупак* – Язэп Сайкоўскі, *Ядвігін Ш.* – Антон Лявіцкі.

Перапіска рэдакцыі з карэспандэнтамі з Вілейскага павета ахоплівала 3 населеныя пункты: *в. Задзеўе, м. Крайск, в. Пасадзец* і адрасавалася *Плаў – ку, А. Петр – чу, І. Білевічу*. Кожны з артыкулаў прысвячаўся асобнаму пытанню. Так, *Плаў – ку* адрасавалася інструкцыя па зборы народных песень, *А – Петр – чу* даваўся адказ пытанне і выказвалася пажаданне на далейшае супрацоўніцтва, пану *І. Білевічу* адрасаваўся напамін аб аплаце за падпіску.

Тэматыка допісаў у рэдакцыю за 1912 год адлюстроўвала грамадска-палітычныя і сацыяльныя падзі: выбары ў Дзяржаўную думу і мясцовую ўладу, несправядлівасць чыноўнікаў, махлярства ўладаў, наватарства ў вядзенні гаспадаркі, п’янства і забойствы, самагубствы, кліматычныя анамаліі, надзвычайныя здарэнні, дабрачыннасць.

Пэўная ўвага надавалася пытанням асветніцка-культурнага жыцця: літаратурныя вечары, пастаноўка спектакляў, адкрыццё школы народнай гаспадаркі, праблемы беларускай мовы, праблемы беларускай культуры, неадукаванасць і бескультур’е сялянства.

Па-ранейшаму, значнае месца на старонках “Нашай Нівы” адводзілася мастацкім творам (у 1912 годзе іх было змешчана 19 і 1 публіцыстычны артыкул). Яны належалі як сталым аўтарам, так і тым, хто спрабаваў свае сілы ў літаратурнай творчасці: А. Петрашкевічу, Змітраку Бядулю, Міхалку Галцы, Старому Вераб’ю, Ядвігіну Ш.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што “Наша Ніва” адыгрывала значную ролю ў жыцці Вілейскага павета, а актыўнасць карэспандэнтаў залежала ад грамадска-палітычных і сацыяльна эканамічных падзей пачатку XX стагоддзя (1912 г.).

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (XVI – пачатак XX ст.). – 519 с.
2. Наша Ніва. – Вып. 5, 1912–915, 1920 гг. (факсімільнае выданне). – Мінск : Навука і тэхніка, 2009.
3. Наша Ніва. Вып. 1, 1906–1908 гг. (факсімільнае выданне). – Мінск : Навука і тэхніка, 1990.
4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 345 с.


# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РЫСЫ ХАРАКТАРУ БЕЛАРУСА Ў РАМАНЕ К. ЦВІРКІ “ВОЎЧАЯ ВЫСПА”


*С А. Янушкевіч*
*ДУА “Сярэдняя школа № 138 г. Мінска”*
*Навук. кір. – Н. У. Зарэцкая, настаўнік беларускай мовы і літаратуры*



**Анатацыя.** У артыкуле даследуюцца рысы нацыянальнага характару беларусаў на аснове крытычнага аналізу сучаснага рамана на гістарычную тэму Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа», а таксама артыкулаў і даследаванняў навукоўцаў па тэме «Нацыянальны характар беларусаў».